(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

УДК 323.1(476) + 94(476) «1929/1939»

АЛЬХОВІК
Мікалай Канстанцінавіч

# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ПАЛІТЫКА Ў БССР (1929–1939 гг.)

**Аўтарэферат дысертацыі**
**на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук**

**па спецыяльнасці 07.00.02 – Айчынная гісторыя**

Мінск, 2017

59 Навуковая праца выканана ў Беларускім дзяржаўным універсітэце.

**Навуковы кіраўнік –** **Зялінскі Пётр Іосіфавіч,**
доктар гістарычных навук, прафесар,
прафесар кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

**Афіцыйныя апаненты:** **Шадурскі Віктар Генадзьевіч,**
доктар гістарычных навук, прафесар,
дэкан факультэта міжнародных адносін
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта;

**Каспяровіч Аляксандр Мікалаевіч,**
кандыдат гістарычных навук, дацэнт,
дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка».

**Апаніруючая арганізацыя – ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі».**

Абарона адбудзецца 25 студзеня 2018 г. у 16.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.01.05 пры Беларускім дзяржаўным універсітэце па адрасе: г. Мінск, вул. Ленінградская, 8 (корпус юрыдычнага факультэта), ауд. 407.

Тэлефон вучонага сакратара: 209-57-09, e-mail: huzhalouski@gmail.com.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Фундаментальнай бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Аўтарэферат разасланы "20" снежня 2017 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый
доктар гістарычных навук прафесар А.А. Гужалоўскі

# УВОДЗІНЫ

Нацыянальная палітыка 1929–1939 гг. займае асаблівае месца ў гісторыі БССР. У гэты перыяд савецкая ўлада адмовілася ад падыходаў да вырашэння нацыянальнага пытання, што склаліся ў 1920-я гг. З сярэдзіны 1930-х гг. галоўная ўвага партыйна-савецкіх органаў засяроджвалася на ўзмацненні пазіцый рускай мовы і культуры ў БССР. Палітыка беларусізацыі і работа сярод нацыянальных меншасцяў былі згорнуты. Збліжэнне і зліццё нацыянальных супольнасцяў пры сацыялізме аб'яўлялася прагрэсіўнай і заканамернай з'явай. Рэвізія канцэпцыі нацыянальнага будаўніцтва істотна паўплывала на грамадска-палітычнае і культурнае развіццё БССР, акрэсліла вектары далейшай нацыянальнай палітыкі і стварыла небяспеку нацыянальнай гамагенізацыі насельніцтва.

Навуковая актуальнасць абранай тэмы дысертацыі звязана з неабходнасцю комплекснага аналізу нацыянальнай палітыкі 1929-1939 гг. у БССР. Па асобных пытаннях нацыянальнага будаўніцтва створаны значны масіў навуковай літаратуры, аднак у айчыннай і замежнай гістарыяграфіі на сённяшні дзень не існуе структурных і абагульняючых работ па тэме даследавання. Апрача таго, гістарычнай навуцы неабходна сфарміраваць узважаны погляд на нацыянальную палітыку ў СССР на розных этапах яе ажыццяўлення. Перыяд фарсіраванага сацыялістычнага будаўніцтва з'яўляецца важным пунктам адліку эвалюцыі савецкай нацыянальнай палітыкі. Асэнсаванне яе феномена немагчыма без вызначэння асаблівасцей нацыянальнага будаўніцтва ў БССР. Практычная значнасць даследавання палягае ў тым, што ва ўмовах будаўніцтва незалежнай Рэспублікі Беларусь выпрацоўка арыенціраў нацыянальнай палітыкі стала адной з першачарговых задач, якія стаяць перад дзяржавай. У гэтай сувязі выяўленне пазітыўнага і негатыўнага вопыту работы дзяржаўных інстытутаў і грамадскіх арганізацый БССР у сферы вырашэння нацыянальнага пытання дазваляе вызначыць магчымыя прыярытэты і перспектывы нацыянальнага будаўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь.

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

## Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі (праектамі) і тэмамі

Тэма дысертацыі адпавядае прыярытэтным напрамкам фундаментальных навуковых даследаванняў у Рэспубліцы Беларусь: Дзяржаўнай праграме фундаментальных і прыкладных навуковых даследаванняў «Гісторыя беларускай нацыі, дзяржаўнасці і культуры» на 2006–2010 гг., Дзяржаўнай праграме навуковых даследаванняў «Гуманітарныя навукі як фактар развіцця

беларускага грамадства і дзяржаўнай ідэалогіі (гісторыя, культура, грамадства, дзяржава)» на 2011–2015 гг., Дзяржаўнай праграме «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства» на 2016–2020 гг.

## Мэта і задачы даследавання

*Мэтай* дысертацыйнага даследавання з'яўляецца выяўленне напрамкаў і вызначэнне этапаў эвалюцыі нацыянальнай палітыкі 1929–1939 гг. у БССР. Для дасягнення пастаўленай мэты прадугледжваецца вырашэнне наступных задач:

- выявіць тэндэнцыі і асаблівасці палітыкі беларусізацыі ў 1929–1933 гг.;
- вылучыць асноўныя напрамкі палітыкі савецкай улады сярод нацыянальных меншасцяў у 1929–1933 гг.;
- раскрыць сутнасць нацыянальнай палітыкі ў дачыненні да беларускага насельніцтва ў 1933–1939 гг.;
- вызначыць характар палітыкі савецкай улады ў дачыненні да нацыянальных меншасцяў у 1933–1939 гг.

*Аб'ектам даследавання* з'яўляецца нацыянальная палітыка ў БССР. *Прадмет даследавання* – нацыянальная праблематыка ў рабоце адміністрацыйных, гаспадарчых, судовых устаноў, партыйных і грамадскіх арганізацый, у галінах дзяржаўнай абароны, адукацыі, асветы, навукі, культуры і друку, уплыў нацыянальнай палітыкі на грамадскія настроі. *Ніжняя мяжа даследавання* (май – верасень 1929 г.) знамянуе сабой пачатак карэнных змен у нацыянальнай палітыцы, якія наступілі ў выніку дзейнасці ў БССР камісіі ЦКК УКП(б) на чале з У.П. Затонскім і вызначэння ЦК КП(б)Б «беларускага нацыяналізму» ў якасці галоўнай небяспекі нацыянальнага будаўніцтва. *Верхняя мяжа* (верасень 1939 г.) вызначаецца пачаткам Другой сусветнай вайны, у ходзе якой да БССР была далучана тэрыторыя Заходняй Беларусі, што выклікала змены ў сацыяльнай і дэмаграфічнай структуры грамадства, культурнай сітуацыі і нацыянальнай палітыцы.

## Навуковая навізна

Дысертацыя мае завершаны характар і з'яўляецца самастойным навуковым даследаваннем, выкананым на падставе выяўлення, аналізу, сістэматызацыі і абагульнення шырокага кола матэрыялаў архіўных і апублікаваных крыніц, крытычнага асэнсавання навуковых работ беларускіх і замежных даследчыкаў. Аўтарам выяўлены значны аб'ём неапублікаваных дакументаў з 20 фондаў 5 архіваў Рэспублікі Беларусь, матэрыялы 34 перыядычных выданняў агульнасаюзнага, рэспубліканскага і ведамаснага ўзроўню. Большая частка выкарыстаных у дысертацыі дакументаў і матэрыялаў уводзіцца ў навуковы ўжытак упершыню.

Дысертацыя з'яўляецца першым у гістарыяграфіі цэласным і абагульняючым даследаваннем па тэматыцы нацыянальнай палітыкі 1929–1939 гг. у БССР. У рабоце паказана эвалюцыя нацыянальнай палітыкі, вызначаны яе напрамкі, этапы, асаблівасці, тэндэнцыі і вынікі, уплыў нацыянальнай палітыкі на грамадскія настроі. Раскрыта залежнасць улад БССР ад рашэнняў кіраўніцтва СССР па нацыянальным пытанні, становішча беларускай, рускай, ідыш, польскай і іншых моў, нацыянальная праблематыка ў рабоце адміністрацыйных, гаспадарчых, судовых устаноў, партыйных і грамадскіх арганізацый, у галінах дзяржаўнай абароны, адукацыі, асветы, навукі, культуры і друку. У мэтах больш поўнага раскрыцця зместу і вынікаў даследавання ў тэксце дысертацыі прыводзяцца дадаткі. Сярод іншага, у дадатках змешчаны слоўнік, у якім утрымліваецца ўпарадкаваны паняційны і тэрміналагічны апарат і звесткі даведачнага характару па тэматыцы дысертацыі, прапанаваны вызначэнні для шэрага тэрмінаў, а таксама табліцы, складзеныя аўтарам самастойна, якія ілюструюць асноўныя вывады дысертацыйнага даследавання.

Выяўлена, што ў 1929–1933 гг. савецкая ўлада захоўвала курс на правядзенне беларусізацыі і работы сярод нацыянальных меншасцяў БССР. Раскрыты асноўныя прычыны перагляду канцэпцыі нацыянальнага будаўніцтва ў сярэдзіне – канцы 1930-х гг. У дысертацыі ўпершыню прапануецца аўтарская перыядызацыя згортвання беларусізацыі і работы сярод нятытульнага насельніцтва. Устаноўлена, што ў 1933–1939 гг. дзяржаўныя і грамадскія ўстановы былі пераведзены з беларускай на рускую мову, зменшылася доля друкаванай прадукцыі на беларускай мове, пачаўся перавод беларускіх школ на рускую мову, улады БССР адмовіліся ад курсу на захаванне дамінуючага становішча беларускай культуры. Вызначаны асноўныя мерапрыемствы па ўзмацненні сферы ўплыву рускай мовы і культуры ў БССР.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

**1.** З пачатку 1920-х гг. магістральным напрамкам нацыянальнай палітыкі ў БССР з’яўлялася беларусізацыя, накіраваная на забеспячэнне дамінуючага становішча беларускага пралетарыяту, беларускай мовы і беларускай сацыялістычнай культуры ў БССР і трансфармацыю беларускай «буржуазнай» нацыі ў «сацыялістычную». Гэта палітыка прадугледжвала абслугоўванне тытульнага насельніцтва на роднай мове, перавод дзяржаўных устаноў і грамадскіх арганізацый на беларускую мову, вылучэнне беларусаў на адказныя і кіраўнічыя пасады, будаўніцтва беларускай сацыялістычнай культуры, захады па выхаванні нацыянальнай самасвядомасці і забеспячэнні колькаснай перавагі беларусаў у складзе пралетарыяту і інтэлігенцыі.

Узмацненне каманднa-адміністрацыйнай сістэмы выклікала змены ў палітыцы беларусізацыі. Інтэлігенцыя БССР была адхілена ад кіравання працэсамі нацыянальнага будаўніцтва, «беларускія нацыяналісты» былі абвінавачаны ў скажэннях нацыянальнай работы. Вылучэнне мясцовых работнікаў без уліку «ідэалагічнай вытрыманасці» і сацыяльнага складу, разуменне нацыянальнай палітыкі як выключна барацьбы «за мову і за культуру» былі асуджаны. Дамінавала крытычнае стаўленне да дарэвалюцыйнай гісторыка-культурнай спадчыны беларускага народа.

Ва ўмовах адсутнасці праграмы цэнтралізаванага пераводу дзяржаўных і грамадскіх інстытутаў на беларускую мову і нерэгулярнага кантролю з боку адказных і кіраўнічых работнікаў галоўным рухавіком беларусізацыі былі вызначаны палітыка-ідэалагічныя і культурна-масавыя кампаніі і мерапрыемствы. У дзяржаўных установах, партыйных і грамадскіх арганізацыях на беларускай мове ажыццяўлялася справаводства, выпіска і выданне газет, палітыка-ідэалагічная і культурна-масавая работа і г.д., аднак падчас сходаў, у прыватных гутарках і рабоце з наведвальнікамі руская мова дамінавала над беларускай. Адначасова былі пераадолены масавыя выпадкі парушэння моўнага рэжыму беларускіх школ, на беларускай мове выдавалася пераважная большасць друкаванай прадукцыі.

**2.** У 1929–1933 гг. у рабоце з нятытульным насельніцтвам вызначыліся два напрамкі. З аднаго боку, улады БССР прытрымліваліся курсу на абслугоўванне нацыянальных меншасцяў на іх роднай мове ў дзяржаўных і грамадскіх інстытутах, стварэнне нацыянальных саветаў, калгасаў, судоў, адукацыйных і іншых устаноў, выхаванне і вылучэнне кадраў на адказныя і кіраўнічыя пасады па прынцыпе прапарцыйнага прадстаўніцтва нацый. З іншага боку, улады БССР рэзка ўзмацнілі курс на інтэрнацыяналізацыю калектываў прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, перасяленне яўрэйскага насельніцтва ў Крым, Бірабіджан, сельскую мясцовасць і гарады буйной прамысловасці, інтэрнацыянальнае выхаванне працоўных мас. Пашырылася практыка стварэння польскіх сельсаветаў, школ і выкладання польскай мовы ў беларускіх школах пасля штучнага залічэння часткі беларусаў-католікаў у палякі. Выявіліся праблемы, звязаныя з невыкананнем выдавецкіх планаў па літаратуры на мовах нацыянальных меншасцяў, закрыццём устаноў і арганізацый нятытульнага насельніцтва з-за недахопу кадраў, літаратуры, памяшканняў, нерэгулярнага кантролю з боку адказных і кіраўнічых работнікаў.

**3.** Згортванне беларусізацыі пачалося пасля прыняцця пастаноў ЦК УКП(б) «Аб сельскагаспадарчых нарыхтоўках у Беларусі» ад 19 снежня 1932 г. і «Аб скрыўленні нацыянальнай палітыкі УКП(б) у Беларусі» ад 2 сакавіка 1933 г., у якіх партыйна-савецкія работнікі БССР былі абвінавачаны ў правядзенні

«гвалтоўнай беларусізацыі». Склалася тэндэнцыя адмовы ад выкарыстання беларускай мовы работнікамі дзяржаўных і грамадскіх інстытутаў, якія ўспрынялі рашэнні ЦК УКП(б) як сігнал аб згортванні беларусізацыі і асцерагаліся абвінавачванняў у «нацыяналізме». Палітыка-ідэалагічныя кампаніі і мерапрыемствы ў падтрымку «бальшавіцкай беларусізацыі», ініцыяваныя асобнымі партыйнымі арганізацыямі, не прынеслі практычнага выніку. У 1937–1939 гг. работнікі і грамадскія актывісты былі вызвалены ад неабходнасці валодання беларускай мовай, а цэнтралізаваны перавод устаноў і арганізацый на беларускую мову быў абвешчаны контррэвалюцыйнай дзейнасцю, накіраванай на «падрыў пазіцый» рускай мовы і культуры ў БССР. ВНУ, ССНУ, ВТНУ і рабфакі перайшлі на рускую мову. З 1933 г. вызначыліся тэндэнцыі змяншэння долі перыядычных выданняў і кніг на беларускай мове, паступовага пераводу беларускіх школ на рускую мову. У 1933–1938 гг. нацыянальныя вайсковыя фарміраванні і школы былі рэарганізаваны ў экстэрытарыяльныя. З другой паловы 1938 г. пытанне вылучэння беларусаў на адказныя і кіраўнічыя пасады адсутнічала на парадку дня. Савецкая ўлада адмовілася ад захавання дамінуючага становішча беларускай савецкай культуры ў БССР. Згортванне палітыкі беларусізацыі стварыла небяспеку дэнацыяналізацыі беларускага насельніцтва.

**4.** У сярэдзіне 1930-х гг. знікненне нацыянальных асаблівасцяў было аб'яўлена прагрэсіўнай з'явай і заканамерным вынікам сацыялістычнага будаўніцтва. У 1933–1937 гг. улады БССР і СССР вагаліся ў выбары генеральнай стратэгіі ў адносінах да нацыянальных меншасцяў, таму ліквідацыя іх устаноў і арганізацый не мела ўсёабдымнага маштабу і суправаджалася захадамі ў падтрымку нацыянальнай ідэнтычнасці. У 1937–1939 гг. савецкая ўлада прытрымлівалася курсу на ліквідацыю нацыянальных школ, саветаў і іншых інстытутаў як асяродкаў антыдзяржаўнай работы. Абслугоўванне палякаў, латышоў, літоўцаў і г.д. на роднай мове было асуджана як «контррэвалюцыйная дзейнасць». Нацыянальныя меншасці, якія мелі свае дзяржаўныя ўтварэнні па-за межамі СССР, трактаваліся як патэнцыйная пагроза дзяржаўнай бяспецы. Канчатковай мэтай дзяржаўнай палітыкі ў адносінах да яўрэяў і цыган з'яўлялася іх дэнацыяналізацыя. Адначасова з 1933 г. у цэнтры ўвагі партыйна-савецкіх органаў БССР знаходзілася забеспячэнне нацыянальных патрэб рускага насельніцтва, узмацненне пазіцый рускай мовы і культуры ў БССР, пашырэнне друку на рускай мове і сеткі рускіх школ, рэабілітацыя і папулярызацыя гісторыка-культурнай спадчыны рускага народа.

## Асабісты ўклад саіскальніка

Увесь аб'ём навукова-даследчыцкай работы па прадстаўленай дысертацыі, уключаючы збор матэрыялу, аналіз крыніц, выкананы саіскальнікам самастойна. Вынікі, якія вынесены на абарону, атрыманы аўтарам самастойна.

## Апрабацыя дысертацыі і інфармацыя аб выкарыстанні яе вынікаў

Дысертацыйны матэрыял быў апрабаваны ў артыкулах і тэзісах дакладаў падчас канферэнцый: навуковыя канферэнцыі студэнтаў і аспірантаў ФФСН БДУ «Философия. Культура. Общество» (14 мая 2006 г., БДУ, Мінск), студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў ФФСН БДУ «Человек. Культура. Общество» (21 мая 2008 г., 20 красавіка 2011 г., 18 красавіка 2012 г., БДУ, Мінск), рэспубліканская навуковая канферэнцыя «Грамадскія рухі і палітычныя партыі ў Беларусі, апошняя чвэрць XIX – пачатак XXI ст.» (23–24 кастрычніка 2008 г., ГрДУ, Гродна), міжнародныя навуковыя чытанні да 130-годдзя з дня нараджэння У.І. Пічэты (28–29 кастрычніка 2008 г., БДУ, Мінск), міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Беларусь: этапы станаўлення дзяржаўнасці: да 90-годдзя ўтварэння БССР» (18 снежня 2008 г., НАНБ, Мінск), міжнародная навуковая канферэнцыя «Этнокультурное развитие Беларуси в XIX – нач. XXI вв. в европейском контексте» (19–20 мая 2010 г., БДУ, Мінск), міжнародная навуковая канферэнцыя да 89-годдзя заснавання БДУ «Беларусь в современном мире» (29 кастрычніка 2010 г., БДУ, Мінск), беларуска-польскі круглы стол «Беларусь – Польшча: два дзесяцігоддзі міждзяржаўных зносін» (11 лістапада 2010 г., БДУ, Мінск), рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя маладых вучоных да 20-годдзя абвяшчэння незалежнасці «Актуальные проблемы отечественной и мировой истории» (26–27 верасня 2011 г., БДУ, Мінск), міжнародная навукова-практычная канферэнцыя маладых вучоных «Научные стремления – 2011» (14–18 лістапада 2011 г., НАНБ, Мінск), міжнародная навуковая канферэнцыя да 90-годдзя стварэння Інстытута беларускай культуры «Институт белорусской культуры и становление науки в Беларуси» (8–9 снежня 2011 г., НАНБ, Мінск), міжнародная навуковая канферэнцыя «Беларусь і суседзі: шляхі фарміравання дзяржаўнасці» (26–27 красавіка 2012 г., ГДУ, Гомель), міжнародныя навукова-тэарэтычныя канферэнцыі «Европа: актуальные проблемы этнокультуры» (22 мая 2012 г., 28 лістапада 2014 г., 10–11 лістапада 2016 г., БДПУ, Мінск), міжнародная навукова-практычная канферэнцыя студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў «Сапеговские чтения – VII: проблемы возникновения и развития белорусской государственности» (21–22 лістапада 2012 г., БДЭУ, Мінск), міжнародная навуковая канферэнцыя «Романовские чтения – 2012» (Магілёў, МДУ, 29 лістапада 2012 г.), рэспубліканская навукова-тэарэтычная канферэнцыя «Консо-

лидация белорусского народа во второй половине XIX – XXI вв.» (5 снежня 2012 г., БНТУ, Мінск), міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Актуальные проблемы социально-гуманитарных наук», прысвечаная 100-годдзю МДУ ім. А.А. Куляшова (18–19 красавіка 2013 г., МДУ, Магілёў), навуковая сесія «Молодежь и наука XXI века: наше завтра – в наших руках» (18–19 красавіка 2013 г., МІТСО, Віцебск), міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Актуальные проблемы социально-гуманитарного знания в контексте обеспечения национальной безопасности» (17–18 мая 2013 г., Ваенная акадэмія РБ, Мінск), міжнародная навуковая канферэнцыя «Восстание 1863–1864 гг. в Польше, Беларуси и Литве: история и память» (17–18 кастрычніка 2013 г., НАНБ, Мінск), міжвузаўская навукова-тэарэтычная канферэнцыя «Человек. Цивилизация. Культура» (сакавік 2014 г., МГЭІ, Мінск), міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Роль этнического, языкового и культурного разнообразия в современном обществе» (29–30 мая 2014 г., МДУХ, Магілёў), навуковая сесія БДМУ (26 студзеня 2016 г., БДМУ, Мінск), рэспубліканская навуковая канферэнцыя «Сохранение национальной идентичности белорусского общества: прошлое, настоящее» (21 мая 2016 г., БарДУ, Баранавічы), міжнародная навуковая канферэнцыя «Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе» (15–16 снежня 2016 г., ГрДУ, Гродна).

### Апублікаванасць вынікаў дысертацыі

Вынікі і асноўныя палажэнні праведзенага даследавання знайшлі адлюстраванне ў 33 публікацыях, у тым ліку: 6 – артыкулы ў навуковых выданнях у адпаведнасці з п. 18 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь (агульным аб'ёмам 3,18 аўт. арк.), 3 – артыкулы ў іншых навуковых выданнях, 18 – артыкулы ў зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый, 6 – тэзісы дакладаў на навуковых канферэнцыях.

### Структура і аб'ём дысертацыі

У аснову выкладання матэрыялу пакладзены праблемна-храналагічны прынцып. Структура даследавання абумоўлена пастаўленымі мэтамі і задачамі, складаецца з пераліку скарачэнняў, уводзін, агульнай характарыстыкі работы, трох глаў, заключэння, бібліяграфічнага спісу, 3 дадаткаў. Поўны аб'ём дысертацыі складае 278 старонак, у тым ліку 3 дадаткі займаюць 92 старонкі. Бібліяграфічны спіс складаецца са спіса выкарыстаных крыніц (999 найменняў) і асабістых публікацый аўтара (33).

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

У **першай главе «Гістарыяграфія, крыніцы, метадалогія і метады даследавання»** праведзены аналіз навуковай літаратуры, апублікаваных і

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА ВУЧОНАЙ СТУПЕНІ

### Артыкулы ў навуковых выданнях у адпаведнасці з п. 18 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь


1. Альховік, М.К. Да пытання аб нацыянальнай палітыцы партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва ў Беларускай ССР у 1930-я гг. / М.К. Альховік // Вестник Полесского государственного университета. Серия общественных и гуманитарных наук. – 2011. – № 1. – С. 3–7.

2. Альховік, М.К. Нацыянальная палітыка ўлад БССР у галіне адукацыі (1929–1939) / М.К. Альховік // Веснік Брэсцкага ўніверсітэта. Серыя 2, Гісторыя. Эканоміка. Права. – 2012. – № 2. – С. 44–48.

3. Альховік, М.К. Палітыка кіраўніцтва БССР у моўным пытанні (1937–1939 гг.) / М.К. Альховік // Весці БДПУ. Серыя 2. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2013. – № 2. – С. 11–14.

4. Альховік, М.К. Два напрамкі ў нацыянальнай палітыцы партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва БССР у 1933 – пачатку 1937 гг. / М.К. Альховік // Научные труды Республиканского института высшей школы. Исторические и психолого-педагогические науки. – Минск, 2013. – Вып. 13, ч. 1. – С. 3–10.

5. Альховік, М.К. Дзве тэндэнцыі ў палітыцы беларусізацыі ў 1929–1933 гг. / М.К. Альховік // Гуманітарна-эканамічны веснік. Навукова-тэарэтычны часопіс. – 2014. – № 3. – С. 50–55.

6. Альховік, М.К. Згортванне палітыкі беларусізацыі ў БССР у 1933–1939 гг. / М.К. Альховік // Гуманітарна-эканамічны веснік. Навукова-тэарэтычны часопіс. – 2015. – № 1. – С. 49–55.


### Артыкулы ў іншых навуковых выданнях


7. Альховік, М.К. Да пытання аб ліквідацыі нацыянальных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак у БССР у 1934–1939 гг. / М.К. Альховік // Сборник научных статей студентов, магистрантов, аспирантов. – Минск, 2012. – Вып. 9, т. 1. – С. 5–7.

8. Альховік, М.К. Нацыянальная палітыка ў галіне друку ў 1929–1933 гг. / М.К. Альховік // Сборник научных статей молодых ученых / редкол. В.Г. Шадурский и др. – Минск, 2012. – Вып. 1. – С. 195–202.

9. Альховік, М.К. Фактар нацыянальных меншасцей і грамадска-палітычнае жыццё БССР у 1937–1939 гг. / М.К. Альховік // Сборник научных статей студентов, магистрантов, аспирантов. – Минск, 2013. – Вып. 10, т. 1. – С. 5–7.

## Артыкулы ў зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый

10. Альховік, М.К. Дыферэнцыяцыя ў шэрагах членаў КП(Б)Б у сувязі з правядзеннем палітыкі беларусізацыі ў пачатку 1920-х гг. / М.К. Альховік // Грамадскія рухі і палітычныя партыі ў Беларусі (апошняя чвэрць XIX – пачатак XXI ст.) : матэрыялы рэсп. навуковай канферэнцыі, Гродна, 23–24 кастрычніка 2008 г. / ГрДУ ім. Я. Купалы. – Гродна, 2009. – С. 216–219.

11. Альховік, М.К. Праблемы і супярэчнасці пры правядзенні нацыянальнай палітыкі ў Беларускай ССР у 1920-я – пачатку 1930-х гг. / М.К. Альховік // Беларусь: этапы станаўлення дзяржаўнасці (да 90-годдзя з дня ўтварэння БССР) : мат-лы міжн. нав.-практ. канф., Мінск, 18 снежня 2008 г. / НАНБ ; рэдкал.: А.А. Каваленя (старшыня) і інш. – Мінск, 2009. – С. 229–232.

12. Альховік, М.К. Этнакультурнае развіццё польскай нацыянальнай меншасці ў 1920–1930-я гг. у ракурсе ўнутранай і знешняй палітыкі СССР / М.К. Альховік // Беларусь – Польшча: два дзесяцігоддзі міждзяржаўных зносін : матэрыялы беларус.-пол. круглага стала, Мінск, 11 ліст. 2010 г. / БДУ ; рэдкал.: В.Г. Шадурскі (навук. рэд.) і інш. – Мінск, 2010. – С. 80–86.

13. Альховік, М.К. Польскі Дзяржынскі раён: «Вітрына сацыялізму» ці правакацыя УКП(б) / М.К. Альховік // Этнокультурное развитие Беларуси в XIX – начале XXI в. : мат-лы межд. науч.-практ. конф., Минск, 19–20 мая 2010 г. / БГУ ; редколл.: Т.А. Новогродский и др. – Минск, 2011. – С. 149–153.

14. Альховік, М.К. Нацыянальная палітыка партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва ў Беларускай ССР у 1930-я гг. / М.К. Альховік // Научные стремления – 2011 : сбор. мат-лов межд. науч.-практ. конф., Минск, 14–18 нояб. 2011 г. : в 2-х т. / Совет молодых ученых НАНБ. – Минск, 2011. – Т. 2. – С. 27–30.

15. Альховік, М.К. Беларуская Акадэмія навук і нацыянальна-культурнае будаўніцтва ў 1929–1934 гг. / М.К. Альховік // Институт белорусской культуры и становление навуки в Беларуси. К 90-летию создания Института бел. культ. : мат-лы межд. науч. конф., Минск, 8–9 дек. 2011 г. – Минск, 2012. – С. 228–234.

16. Альховік, М.К. Да пытання аб уплыве палітыкі партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва БССР на нацыянальную самасвядомасць беларусаў у 1929–1939 гг. / М.К. Альховік // Беларусь і суседзі: гістарычныя шляхі, узаемаадзеянне і ўзаемаўплывы : зборн. нав. арт. міжн. навук. канф., Гомель, 12-13 крас. 2012 г. / ГДУ імя Ф. Скарыны ; рэдкал.: Р.Р. Лазько і інш. – Гомель, 2012. – С. 217–222.

17. Альховік, М.К. Да пытання аб асіміляцыі нацыянальных меншасцяў БССР у 1934–1939 гг. / М.К. Альховік // Европа: актуальные проблемы этнокультуры : мат-лы V межд. научно-практ. конф., Минск, 22 мая 2012 г. / БГПУ. – Минск, 2012. – С. 227–229.

18. Альховік, М.К. Уплыў нацыянальнай палітыкі на вывучэнне культуры

насельніцтва БССР у 1929–1935 гг. / М.К. Альховік // Романовские чтения – 9 : сборн. статей межд. науч. конф., Могилев, 29 ноября 2012 г. / МГУ им. А.А. Кулешова. – Могилев, 2013. – С. 118–119.

19. Альховік, М.К. Пытанне беларусізацыі ў грамадска-палітычным жыцці БССР / М.К. Альховік // Материалы XVI научной сессии преподавателей и студентов, Витебск, 18–19 апреля 2013 г. / Витебский филиал УО ФПБ "МИТСО", редколл.: В.А. Космач (отв. ред.) и др. – Витебск, 2013. – С. 8–9.

20. Альховік, М.К. Нацыянальная палітыка ў адносінах да яўрэйскага насельніцтва і яе ўплыў на грамадска палітычнае жыццё БССР у 1937–1939 гг. / М.К. Альховік // Актуальные проблемы социально-гуманитарных наук: мат-лы межд. науч.-практ. конф., Могилев, 18–19 апр. 2013 г. / Могил. гос. ун-т им. А.А. Кулешова, ред. совет: В. В. Борисенко и др. – Могилев, 2013. – С. 106–108.

21. Альховік, М.К. Да пытання аб сутнасці і перыядызацыі нацыянальнай палітыкі 1929–1939 гг. у БССР / М.К. Альховік // Актуальные проблемы социально-гуманитарного знания в контексте обеспечения национальной безопасности: мат-лы межд. науч.-практ. конф., посвящ. 60-летию создания каф. соц. наук ВА РБ, Минск, 16–17 мая 2013 г.: в 2-х ч. / Воен. акад. Респ. Бел.; редкол.: В.А. Ксенофонтов и др. – Минск, 2014. – Ч. 1. – С. 115–117.

22. Альховік, М.К. Паўстанне 1863 г. і эвалюцыя бальшавіцкай ідэалогіі на Беларусі ў 1929–1941 гг. / М.К. Альховік // Паўстанне 1863–1864 гг. у Польшчы, Беларусі, Літве і Украіне : гісторыя і памяць: зб. навук. арт. канф., Мінск, 17–18 кастр. 2013 г. / НАНБ, Ін-т гісторыі; рэдкал.: А.А. Каваленя і інш. – Мінск, 2014. – С. 34–41.

23. Альховік М.К. Палітыка беларусізацыі ў 1929–1934 гг. / М.К. Альховік // Человек. Цивилизация. Культура : мат-лы межвуз. науч.-теор. конф., Минск, апрель 2014 г. / МГЭИ; редколл.: А.Н. Алпеев и др. – Минск, 2014. – С. 4–7.

24. Альховік, М.К. Фактар беларускай мовы ў грамадска-палітычным жыцці БССР у 1933–1939 гг. / М.К. Альховік // Этнічная, моўная і культурная разнастайнасць у сучасным грамадстве : зборнік навук. прац удзельнікаў міжнар. навук.-практ. канф., Магілёў, 29–30 мая 2014 г. / Маг. дзярж. ун-т харч. ; рэдкал.: Ю.М. Бубнаў і інш. – Магілёў, 2014. – С. 323–328.

25. Альховік, М.К. Фактар нацыянальных меншасцей і грамадска-палітычнае жыццё БССР у сярэдзіне 1937 – сярэдзіне 1939 гг. / М.К. Альховік // Европа: актуальные проблемы этнокультуры (к 100-летию БГПУ): мат-лы VIII межд. науч.-практ. конфер., Минск, 22 дек. 2014 г. – Минск, 2014. – С. 208–210.

26. Альховік, М.К. Нацыянальная палітыка 1929 – 1939 гг. у БССР і яе ўплыў на нацыянальную ідэнтычнасць насельніцтва / М.К. Альховік // Сохранение национальной идентичности белорусского общества: прошлое,

настоящее, перспективы: мат-лы респ. науч. конф., Барановичи, 21 апр. 2016 г. / РИО БарГУ; редкол.: А.В. Никишова и др. – Барановичи, 2016. – С. 8–12.

27. Альховік, М.К. Моўны рэжым беларускіх агульнаадукацыйных школ БССР у сярэдзіне – канцы 1930-х гг. / М.К. Альховік // Европа: актуальные проблемы этнокультуры. История и культура Беларуси : мат-лы IX межд. науч.-теорет. конф., Минск, 10–11 нояб. 2016 г. / Белорус. гос. пед. ун-т им. М. Танка; редкол.: А.В. Касович и др. – Минск, 2016. – С. 6–9.

**Тэзісы дакладаў на навуковых канферэнцыях**

28. Альховік, М.К. Развіццё беларускай нацыянальнай ідэі ў перыяд правядзення палітыкі беларусізацыі ў БССР / М.К. Альховік // Сборник работ 65-й научной конференции студентов и аспирантов Белорусского государственного университета, Минск, 13-16 мая 2008 г.: в 3-х ч. / БГУ. – Минск, 2008. – Ч. 1. – С. 252–255.

29. Альховік, М.К. Этнакультурнае развіццё польскай нацыянальнай меншасці ў 1920–1930-я гг. у ракурсе ўнутранай і знешняй палітыкі СССР / М.К. Альховік // Беларусь в современном мире : мат-лы IX межд. науч. конф., посвящ. 89-летию образования Белорус. гос. ун-та, Минск, 29 окт. 2010 г. / редкол. : В.Г. Шадурский и др. – Минск, 2010. – С. 20–21.

30. Альховік, М.К. Беларуская нацыянальная ідэя ў 1930-я гг. / М.К. Альховік // Человек. Культура. Общество: мат-лы VIII науч. конф. студентов, магистрантов и аспирантов фак. филос. и соц. наук БГУ, Минск, 20 апр. 2011 г. / редколл.: А.А. Легчилин и др. – Минск, 2012. – С. 58–60.

31. Альховік, М.К. Прычыны ліквідацыі нацыянальных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак у БССР у 1934–1939 гг. / М.К. Альховік // Проблемы возникновения и развития белорусской государственности (к 1150-летию первого летописного упоминания о госуд. образ-ниях у вост. славян): мат-лы межд. науч.-теор. конф., Минск, 20 нояб. 2012 г. / БГЭУ. – Минск, 2012. – С. 9–10.

32. Альховік, М.К. Этнакультурная палітыка савецкіх улад і нацыянальная ідэнтычнасць насельніцтва БССР / М.К. Альховік // Консолидация белорусского народа во второй половине XIX-XXI вв. : мат-лы респ. науч.-теор. конф., Минск, 5 декабря 2012 г. / БНТУ. – Минск, 2012. – С. 46–49.

33. Альховік, М.К. Інстытут філасофіі Беларускай акадэміі навук і нацыянальная палітыка ў БССР у 1930-я гг. / М.К. Альховік // Человек. Культура. Общество: мат-лы XI науч. конф. студентов, магистрантов и аспирантов фак. филос. и соц. наук БГУ, Минск, 18 апр. 2012 г. / редколл.: А.А. Легчилин и др. – Минск, 2014. – С. 5–7.

## РЕЗЮМЕ

**Альховик Николай Константинович**

**Национальная политика в БССР (1929–1939 гг.)**

**Ключевые слова:** национальная политика, языковая политика, культурная политика, белорусский язык, белорусская культура, белорусизация, коренизация, белорусы, национальные меньшинства.

**Цель исследования**: выявление направлений и определение этапов эволюции национальной политики 1929-1939 гг. в БССР.

**Методы исследования:** общелогические, общенаучные, специально-исторические. Для характеристики национальных процессов в БССР использовалась теория модернизации. Междисциплинарность исследования предопределила использование методов этнополитологии и этносоциологии.

**Полученные результаты и их новизна:** диссертация подводит итоги в изучении национальной политики 1929-1939 гг. и является первым целостным и обобщающим трудом по данной тематике. Показана эволюция национальной политики, определены ее этапы, направления, особенности, тенденции и результаты, влияние на общественные настроения. Раскрыта зависимость властей БССР от решений руководства СССР по национальному вопросу, положение белорусского, русского, идиш, польского и других языков, национальная проблематика в работе административных, хозяйственных, судебных учреждений, партийных и общественных организаций, в областях государственной обороны, образования, просвещения, науки, культуры и печати. Выявлено, что в 1929–1933 гг. советская власть сохраняла курс на проведение белорусизации и работы среди национальных меньшинств. Раскрыты основные причины пересмотра концепции национального строительства в середине-конце 1930-х гг. Установлено, что в 1933–1939 гг. происходил процесс сужения сферы использования и функций белорусского языка, отказа от сохранения доминирующего положения белорусской культуры. Определены основные мероприятия советской власти по расширению сферы влияния русского языка и культуры в БССР.

**Рекомендации по использованию:** результаты исследования могут быть использованы ВУЗами и научными учреждениями для разработки спецкурсов, для подготовки рекомендаций, инструкций и аналитических материалов для органов государственного управления.

**Область применения:** история Беларуси, этнополитология, этносоциология, белорусская филология, белорусская культурология.

# РЭЗЮМЭ

**Альховік Мікалай Канстанцінавіч**

## Нацыянальная палітыка ў БССР (1929–1939 гг.)

**Ключавыя словы:** нацыянальная палітыка, моўная палітыка, культурная палітыка, беларуская мова, беларуская культура, беларусізацыя, каранізацыя, беларусы, нацыянальныя меншасці.

**Мэта даследавання:** выяўленне напрамкаў і вызначэнне этапаў эвалюцыі нацыянальнай палітыкі 1929–1939 гг. у БССР.

**Метады даследавання:** агульналагічныя, агульнанавуковыя, спецыяльна-гістарычныя. Для характарыстыкі нацыянальных працэсаў у БССР выкарыстоўвалася тэорыя мадэрнізацыі. Міждысцыплінарнасць даследавання прадвызначыла выкарыстанне метадаў этнапаліталогіі і этнасацыялогіі.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна:** дысертацыя падводзіць вынікі ў вывучэнні нацыянальнай палітыкі 1929-1939 гг. і з'яўляецца першай цэласнай і абагульняючай працай па дадзенай тэматыцы. Паказана эвалюцыя нацыянальнай палітыкі, вызначаны яе этапы, напрамкі, асаблівасці, тэндэнцыі і вынікі, уплыў на грамадскія настроі. Раскрыта залежнасць улад БССР ад рашэнняў кіраўніцтва СССР па нацыянальным пытанні, становішча беларускай, рускай, ідыш, польскай і іншых моў, нацыянальная праблематыка ў рабоце адміністрацыйных, гаспадарчых, судовых устаноў, партыйных і грамадскіх арганізацый, у галінах дзяржаўнай абароны, адукацыі, асветы, навукі, культуры і друку. Выяўлена, што ў 1929–1933 гг. савецкая ўлада захоўвала курс на правядзенне беларусізацыі і работы сярод нацыянальных меншасцяў. Раскрыты асноўныя прычыны перагляду канцэпцыі нацыянальнага будаўніцтва ў сярэдзіне-канцы 1930-х гг. Устаноўлена, што ў 1933–1939 гг. адбываўся працэс звужэння сферы выкарыстання і функцый беларускай мовы, улады БССР адмовіліся ад захавання дамінуючага становішча беларускай культуры. Упершыню прапанавана перыядызацыя згортвання беларусізацыі і работы сярод нятытульнага насельніцтва. Вызначаны асноўныя мерапрыемствы савецкай улады па пашырэнні сферы ўплыву рускай мовы і культуры ў БССР.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні:** вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны ВНУ і навуковымі ўстановамі для распрацоўкі спецкурсаў, для падрыхтоўкі рэкамендацый, інструкцый і аналітычных матэрыялаў для органаў дзяржаўнага кіравання.

**Галіна выкарыстання:** гісторыя Беларусі, этнапаліталогія, этнасацыялогія, беларуская філалогія, беларуская культуралогія.

## SUMMARY

**Alchovik Mikałaj Kanstancinavič**

## National policy in the BSSR (1929–1939).

**Keywords:** national policy, language policy, cultural policy, the Belarusian language, the Belarusian culture, Belarusization, indigenization, the Belarusians, national minorities.

**Objective**: to identify directions and stages of the evolution of the national policy in the Belarusian SSR in 1929–1939.

**Methods:** general logical, general scientific, special historical methods. Modernization theory was used to characterize national processes in the BSSR. Interdisciplinary research consists in using ethnopolitology and ethnosociology methods.

**The results and their novelty**: the thesis summarizes the studies of the national policy in 1929-1939 and represents the first complex and generalizing research of this subject. The evolution of the national policy is revealed. Its stages, directions, features, trends and results of the national policy in the Byelorussian SSR in 1929-1939 are determined. The dependence of the BSSR authorities on the decisions of the Soviet leadership on the national question is revealed. The position of Belarusian, Russian, Yiddish, Polish and other languages is established. National problems in the activities of administrative, economic, judicial institutions, party and public organizations, in the areas of state defense, education, enlightenment, science, culture and the press is identified. It was revealed that Soviet power maintained its Belarusization policy and work among national minorities in 1929-1939. The main reasons for the revision of the concept of the national construction in the mid-late 1930s are disclosed. For the first time the periodization of the curtailment of Belarusisation and work among the non-titular population was proposed. It is established that there was a process of narrowing the scope of use and functions of the Belarusian language, refusing to preserve the dominant position of the Belarusian culture in 1933-1939. The main measures of the Soviet authorities to expand the sphere of influence of the Russian language and culture in the BSSR are determined.

**Recommendations on use**: results of the research can be used in universities and research institutions to develop special courses, to make recommendations, instructions and analytical materials for government bodies.

**Scope:** history of Belarus, ethnopolitology, ethnosociology, Belarusian philology, Belarusian culturology.